# § 42. Эканамічнае становішча Беларусі ў XVI — першай палове XVII ст.

ФАЛЬВАРАК ПАХОЖЫЯ ВАЛОКА
МАГДЭБУРГСКАЕ ПРАВА НЕПАХОЖЫЯ
ГОСЦІ СЯЛЯНЕ-СЛУГІ
ГІЛЬДЫЯ ПРАСАЛЫ ПРЫГОННЫЯ
АСАДНЫЯ ГАСЦІНЦЫ
ЧЭЛЯДЗЬ НЯВОЛЬНАЯ ЦЭХ
ЦЯГЛЫЯ АГАРОДНІКІ

Перадумовы пераўтварэнняў

**1. Перадумовы і асаблівасці станаўлення фальваракова-паншчыннай гаспадаркі на тэрыторыі Беларусі.** Сацыяльна-эканамічныя працэсы, што адбываліся ў Заходняй Еўропе ў канцы XV — пачатку XVI ст., выклікалі імклівы рост гарадскога насельніцтва. Гэта, у сваю чаргу, павысіла попыт на сельскагаспадарчую прадукцыю. Жаданне павялічыць даходнасць сваіх гаспадарак ад продажу на еўрапейскі рынак збожжа падштурхнула шляхту ВКЛ на стварэнне **фальваркаў**. На тэрыторыі Беларусі яны ўтвараліся з так званых «двароў», якія былі прызначаны для забеспячэння асабістых патрэб феадала і ўтрымання яго адміністрацыі. Фальваркавая гаспадарка, у адрозненне ад «двара», мела таварны характар і была заснавана на працы прыгонных сялян, асноўным відам феадальнай павіннасці якіх была паншчына. Таму падобная сістэма гаспадарання атрымала назву *фальваракова-паншчыннай*.

**Фальварак** — феадальная гаспадарка, заснаваная на працы залежных сялян і арыентаваная на выраб збожжа на продаж.

Успомніце, якія працэсы паспрыялі росту гарадскога насельніцтва Заходняй Еўропы ў ранні Новы час.

З'яўленне першых фальваркаў

Першыя фальваркі на тэрыторыі Беларусі з'явіліся ў канцы XV — першай палове XVI ст. Найбольшае пашырэнне яны атрымалі ў Падзвінні і Панямонні — мясцінах з развітымі рачнымі гандлёвымі шляхамі і прыстанямі, зручнымі для вывазу

сельскагаспадарчай прадукцыі. Далейшае развіццё фальваркі атрымалі ў сувязі з правядзеннем аграрнай рэформы.

Асноўная мэта рэформы

**2. «Валочная памера», яе значэнне і наступствы.** У мэтах павышэння сваіх даходаў вялікі князь літоўскі і кароль польскі *Жыгімонт II Аўгуст* ажыццявіў першую вядомую на тэрыторыі Беларусі эканамічную рэформу — *«валочную памеру»*. Прыкладам для манарха была гаспадарчая дзейнасць яго маці *Боны Сфорцы* ва ўладаннях пад Пінскам і Клецкам.

Валока — адзінка вымярэння зямлі

Рэформы праводзіліся ў адпаведнасці з дакументам «Устава на валокі», прынятым у **1557 г.** Уся зямля абмервалася і дзялілася на надзелы — *валокі* (1 валока = 21,36 га, або 30 моргаў; 1 морг = 0,71 га). У выпадку, калі зямля на выдзеленым участку была непрыдатная для земляробства, валока магла мець і большыя памеры.

Чаму рэформа атрымала назву «валочная памера»?

Валокі з найлепшымі, найбольш урадлівымі землямі забіралі пад фальваркі, а астатнія дзялілі паміж вясковымі дварамі. Па ўмовах рэформы кожная сялянская сям'я атрымоўвала столькі зямлі, колькі магла апрацаваць. У асноўным сяляне бралі паўвалокі, г. зн. адну валоку апрацоўвалі дзве сялянскія сям'і, часцей за ўсё паяднаныя сваяцкімі сувязямі (бацька з сынам або два браты). Апроч уласных надзелаў яны маглі карыстацца агульнымі ўгоддзямі — сенакосамі, выганамі, лясамі, рэкамі і азёрамі.



*Жыгімонт II Аўгуст*

Сяляне, якія прымалі зямлю, прымацоўваліся да яе і выконвалі павіннасці, памер якіх вызначаўся з улікам якасці глебы. Суадносіны паміж фальварачнай і сялянскай зямлёй былі 1:7 (землекарыстальнікі сямі сялянскіх валок апрацоўвалі адну фальварачную).

Валока — адзінка абкладання сялян павіннасцямі

Паводле «Уставы на валокі» сялянскія надзелы былі ў асноўным двух відаў: *цяглыя* — за карыстанне імі сяляне адпрацоўвалі паншчыну, і *асадныя* —

плацілі чынш. Дадатковымі павіннасцямі былі талокі, гвалты, дзякла, а таксама перавозка грузаў, будаўніцтва і рамонт мастоў, ахова панскіх двароў і іншае. Частка валок адводзілася для *сялян-слуг*, якія выконвалі дваровую, рамесную або іншую службу і былі вызвалены ад звычайных павіннасцей. Невялікія ўчасткі зямлі па тры моргі атрымала чэлядзь нявольная, якая такім чынам ператваралася ў *агароднікаў*.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З «Уставы на валокі» 1557 г.**

…Фальваркі хочам меці, каб паўсюль былі чым больш, пры кожным замку і двары нашым, апроч дзе б грунты злыя і нядобрыя былі… аброку з валокі грунту добрага — 21 грош, з сярэдняга — 12 грошаў, з подлага [малаўрадлівай глебы] — 8 грошаў, з дужа подлага, пясчанага або забалочанага — 6 грошаў; аўсу з валок добрага і сярэдняга грунту — па дзве бочкі, а з подлага — адна бочка… а за адвоз бочкі кожнай — 5 грошаў; з тых жа памянёных грунтаў з кожнай валокі сена воз адзін або 3 грашы за сена, а за адвоз 2 грашы, а з вельмі подлага грунту маюць даваць гусь або паўтара гроша, курэй двое або пенязямі [дробная літоўская манета; 10 пенязяў складалі 1 грош] 16, яйкаў дваццаць або пенязямі 4… работа цяглым людзям з кожнай валокі па два на тыдзень, а талакі чатыры летам, з чаго скажуць, за што маюць быць вызвалены ад работы на тыдзень на Божае нараджэнне, на мясапуст [час, калі хрысціянам забаронена ўжываць мясную ежу] тыдзень, на Вялікдзень тыдзень…

1. *Ад чаго, згодна з дакументам, залежаў памер феадальных павіннасцей сялян?*
2. *На якія катэгорыі дзялілася зямля?*
3. *Назавіце нормы павіннасцей цяглых сялян з валокі.*
4. *Палічыце, колькі дзён паншчыны за год адпрацоўвалі цяглыя сяляне з улікам таго, што летам яны выходзілі на чатыры дні талакі.*

### Вынікі аграрнай рэформы

Напрыканцы XVI ст. валочная памера завяршылася ў заходняй і цэнтральнай частках беларускіх зямель, крыху пазней — ва ўсходніх і паўднёвых. У беларускім Падняпроўі фальварачна-паншчынная сістэма не атрымала пашырэння з прычыны прыродных умоў — малаўрадлівых глеб.

Вынікам аграрнай рэформы зрабіўся рост даходнасці як дзяржаўных, так і прыватных уладанняў, што ў цэлым спрыяла гаспадарчай стабільнасці дзяржавы. Замацавалася трохполле, удасканальваліся прылады працы, павысілася ўраджайнасць. Рэформа ўпарадкавала сялянскія павіннасці. Ва ўсіх відах маёнткаў у сялян адной катэгорыі яны былі аднолькавыя і вызначаліся колькасцю валок, якія знаходзіліся ў іх карыстанні.

Растлумачце, з чым былі звязаны больш познія тэрміны завяршэння рэформы ва ўсходніх і паўднёвых рэгіёнах Беларусі.

### Канчатковае запрыгоньванне сялян

Аднак далейшае развіццё фальварачна-паншчыннай сістэмы прывяло да ўзмацнення прыгоннага права. Рэформа заканадаўча «прымацавала» да зямлі ўсіх сялян, што карысталіся валокамі. Прынятыя неўзабаве Статуты 1566 і 1588 гг. усталявалі спачатку 10-, а пасля 20-гадовы тэрмін пошуку збеглых сялян і вяртання іх уладальнікам. Гэта азначала канчатковае юрыдычнае афармленне прыгоннага права ў Беларусі і ва ўсім ВКЛ.

## ЭТАПЫ ЮРЫДЫЧНАГА АФАРМЛЕННЯ ПРЫГОННАГА ПРАВА Ў ВКЛ

| | |
|---|---|
| ? | • Даваў феадалам права чыніць суд над залежнымі сялянамі<br>• Забараняў феадалам прымаць збеглых |
| ? | • Уводзіў пакаранне за дапамогу збеглым сялянам |
| **I Статут ВКЛ 1529 г.** | • Уводзіў «земскую даўніну»: «пахожы» селянін, які пражыў на зямлі феадала больш за 10 гадоў, рабіўся «непахожым» |
| **«Устава на валокі» 1557 г.** | • Замацоўвала сялян за валокамі |
| **II Статут ВКЛ 1566 г.** | • Пацвярджаў «земскую даўніну»<br>• Уводзіў 10-гадовы тэрмін пошуку збеглых сялян |
| **III Статут ВКЛ 1588 г.** | • Уводзіў 20-гадовы тэрмін пошуку збеглых сялян |

Назавіце дакументы, якія паклалі пачатак запрыгоньванню сялян.

На тэрыторыі Беларусі фальваракча-паншчынная сістэма праіснавала да адмены прыгоннага права ў 1861 г.

Рост гарадоў і гарадскога насельніцтва

**3. Гарады, іх функцыі, заняткі насельніцтва.** Адначасова з развіццём сельскай гаспадаркі адбываўся далейшы рост гарадоў і мястэчак. Імкнучыся пазбыцца феадальнай залежнасці, мяшчане жадалі атрымаць магдэбургскае права. Да канца XVI ст. яго ўжо мелі многія гарады Беларусі. Разам з тым у іх павялічвалася колькасць юрыдык, якія не падпарадкоўваліся органам гарадскога самакіравання.

Змены ў вонкавым выглядзе гарадоў

У гэты перыяд змяніўся знешні выгляд гарадскіх паселішчаў. Цэнтрам горада замест замка зрабілася гандлёвая плошча. Да яе сыходзіліся галоўныя вуліцы, тут узводзілі цагляныя будынкі, але жылая забудова заставалася пераважна драўлянай. Так, напрыклад, у Гродне былі тры плошчы: Старая, Нямецкая і Занёманская, 32 вуліцы, 5 трактаў. Грамадскі цэнтр з замка быў перанесены на новую плошчу, на якую выходзіла сем вуліц. На ёй размяшчаліся каменны касцёл, ратуша, прыходская царква, гандлёвыя рады, карчма, дамы заможных грамадзян. Вуліцы ў горадзе брукавалі, а з 1541 г. у Гродне дзейнічаў водаправод.

Адным з найбуйнейшых гарадоў Беларусі зрабіўся Магілёў. У пачатку XVII ст. там налічвалася больш за 10 тыс. жыхароў, 2121 дом і 240 крам.

Павелічэнне колькасці рамесных прафесій і спецыяльнасцей

Як і раней, гарады выконвалі шэраг функцый: гаспадарчую (цэнтры рамяства і гандлю), адміністрацыйную, ваенную, рэлігійную і культурную. У XVI — першай палове XVII ст. у гарадах і мястэчках актыўна развівалася рамяство, з'яўляліся новыя прафесіі і спецыяльнасці. Паводле падлікаў вучоных, у дзяржаўных гарадах існавала каля 200 прафесій і спецыяльнасцей, а ў прыватнаўладальніцкіх — 120. Найбольшае пашырэнне атрымалі кавальская, ганчарная, кравецкая, шавецкая справа, цяслярства, бондарства. У пашырэнні

рамёстваў назіралася пэўная спецыялізацыя. Напрыклад, у Гродне былі шырока прадстаўлены будаўнічыя спецыяльнасці; у Полацку і Віцебску — прафесіі, звязаныя з абслугоўваннем рачных партоў. Магілёў і Слуцк вылучаліся вялікай колькасцю спецыялістаў-гарбароў і майстроў па метале. Апроч рамёстваў жыхары гарадоў і мястэчак займаліся промысламі, пра што сведчаць млыны, рудні, бровары. У буйны́х гарадах рамеснікі складалі каля паловы жыхароў, у сярэдніх — 40 %, у мястэчках — 20 %.



*Гродна ў 1568 г. Гравюра канца XVI ст.*

**Цэхі — прафесійныя аб'яднанні рамеснікаў**

Для абароны сваіх эканамічных інтарэсаў беларускія рамеснікі пачалі ствараць у XVI ст. карпаратыўныя прафесійныя арганізацыі — *цэхі*, якія ўзначальваліся *цэхмістрамі*. Цэхі аб'ядноўвалі рамеснікаў адной або некалькіх сумежных спецыяльнасцей і абаранялі іх ад канкурэнцыі, перавырабу тавару. Аснову цэха складалі самастойныя рамеснікі — *майстры*, якія мелі ўласную майстэрню і дасканала валодалі прафесіяй. Звычайна ў іх распараджэнні былі памочнікі — падмайстры (чаляднікі) і вучні. Падмайстры за сваю працу атрымлівалі грашовую плату і праз час маглі зрабіцца майстрамі. Для гэтага неабходна было самастойна зрабіць «штуку» («шэдэўр»), унесці ў цэхавую казну пэўную грашовую суму і пачаставаць майстроў вячэраю. Праца вучняў не аплачвалася, іх часцяком выкарыстоўвалі ў якасці прыслугі ў доме. Тэрмін вучнёўства рэгламентаваўся статутам цэха і мог складаць ад трох да пяці гадоў. Пасля заканчэння навучання вучні пераходзілі ў падмайстры. Адначасова з цэхавымі рамеснікамі ў горадзе працавалі *партачы* — рамеснікі, якія не ўваходзілі ў цэх. За продаж прадукцыі іх штрафавалі, адбіралі тавар і намагаліся выгнаць з гарадоў.

Успомніце, калі ў краінах Заходняй Еўропы з'явіліся цэхі.

**Формы гандлю**

**4. Развіццё ўнутранага і знешняга гандлю.** Развіццё рамеснай вытворчасці спрыяла пашырэнню гандлю, як унутранага, так і знешняга. Раслі

гандлёвыя сувязі паміж горадам і вёскай, паміж асобнымі гарадамі, а таксама з іншымі краінамі. Штодзённую пакупніцкую патрэбу забяспечвалі крамы. Ва ўсіх гарадах і мястэчках у пэўныя дні, звычайна адзін-два разы на тыдзень, праходзілі таргі (базары), для правядзення якіх адводзілі спецыяльныя месцы — рынкі. Некалькі разоў на год ладзіліся *кірмашы*.

**Стварэнне аб'яднанняў купцоў**

Купцы, як і рамеснікі, стваралі свае аб'яднанні — братэрствы, або *гільдыі*. У Беларусі так званыя купецкія сотні ў Полацку і Віцебску былі вядомыя яшчэ з XII ст., але толькі ад XVI ст. братэрствыператварыліся ў сапраўдныя гандлёвыя карпарацыі, якія мелі свой статут, памяшканне для сходаў, казну, пячатку, зброю. Яны вызначалі правілы гандлю ў гарадах і іх наваколлях, баранілі інтарэсы сваіх сябраў. Тым, хто не ўваходзіў у купецкае братэрства, забаранялася гандляваць у горадзе. Зрабіцца ўдзельнікам такой арганізацыі было няпроста. Кандыдаты мусілі атрымаць рэкамендацыі ад купцоў братэрства, прынесці прысягу магістрату і ўнесці ўступны ўзнос.

**Экспарт і імпарт у ВКЛ**

Купцы набывалі за мяжой сукно, тканіны, жалеза, свінец, волава, паперу, цвікі, косы, сярпы, нажы, галантарэю, віно, селядцоў, соль і іншыя тавары, многія з якіх выкарыстоўваліся для транзітнага гандлю. Перапрадаючы іх, купцы атрымлівалі значныя даходы. З тэрыторыі Беларусі вывозілі прадукты сельскай і лясной гаспадаркі. Сялянская гаспадарка і рамяство ў гэты час забяспечвалі ўнутраныя патрэбы ў сельскагаспадарчай прадукцыі, прыладах працы, таварах паўсядзённага попыту, а фальварак працаваў галоўным чынам на рынак.

> Успомніце, як называліся дробныя гандляры і купцы, якія ажыццяўлялі ўнутраны гандаль.

**Развіццё шляхоў зносін і сродкаў перамяшчэння**

Паміж гарадамі складаліся шляхі зносін — *гасцінцы*, якія звязвалі ў адно цэлае рынкі гарадоў Рэчы Паспалітай. Тавары перавозілі на калёсах, вазах, рачных караблях і плытах. Хуткасць руху залежала ад якасці дарогі: у XVII ст. для абозаў яна складала

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Сярод рэчаў, якія купцы ўвозілі ў ВКЛ, былі срэбраныя «яфімкі».

*1. Што гэта? Якая сувязь паміж «яфімкамі» і іяхімсталерамі?*
*2. Срэбраныя «яфімкі» для беларускіх купцоў з'яўляліся прадметам транзітнага гандлю з Заходняй Еўропы ў Маскоўскую дзяржаву. Чаму там яны карысталіся такім попытам?*
*3. Што значыць «яфімак з прызнакам»?*
*4. Якая сувязь паміж яфімкамі і Медным бунтам 1662 г. у Расіі?*



*Яфімак з прызнакам. 1655 г.*

20–30 км у суткі, для асобных экіпажаў — 40–50 км, для вершнікаў — да 70–80 км. У 1688 г. з Варшавы да Магілёва можна было даехаць за 13 дзён.

У XVI — першай палове XVII ст. беларускія гарады былі цэнтрамі рамяства і гандлю, аднак больш за палову іх насельніцтва займалася сельскай гаспадаркай і промысламі.

#### Нарастанне сацыяльных супярэчнасцей у гарадах

Эканамічнае развіццё гарадоў стала крыніцай маёмаснай дыферэнцыяцыі іх жыхароў. Ужо ў другой палове XVI ст. выразна праявіўся падзел мяшчан на багатую вярхушку і беднату. Уся ўлада была засяроджана ў руках заможнай часткі гараджан. Яе злоўжыванні і самавольствы прыводзілі да пратэстаў з боку гарадскіх нізоў. У XVII ст. найбольш значныя гарадскія паўстанні адбыліся ў Магілёве і Мазыры. Незадаволенасць гараджан выклікаў таксама асаблівы статус насельніцтва юрыдык, якое карысталася гарадской інфраструктурай, але не плаціла ў гарадскую казну падаткаў і не выконвала грамадскіх работ.




*Эканоміка Беларусі ў XVI — першай палове XVII ст.*

Выкарыстоўваючы інфармацыю з картасхемы, раскажыце пра эканамічнае развіццё Беларусі ў XVI — першай палове XVII ст.

*Такім чынам, у XVI — першай палове XVII ст. на тэрыторыі Беларусі была праведзена «валочная памера» — аграрная рэформа, якая спрыяла павышэнню прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы. Паступова развіваліся таварна-грашовыя адносіны і складваліся элементы рынку, што, у сваю чаргу, спрыяла развіццю гандлю. Выключнае значэнне для тэрыторыі Беларусі меў знешні і транзітны гандаль, у які актыўна ўключаліся фальваркі.*

| **калі ў свеце...** | **на тэрыторыі Беларусі...** |
|---|---|
| Канец XV ст. — пачатак працэсу першапачатковага накаплення капіталу ў Англіі | 1557 г. — правядзенне ў ВКЛ аграрнай рэформы «валочнай памеры» |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Што такое фальварачна-паншчынная сістэма гаспадарання? Назавіце галоўную прычыну яе пашырэння ў ВКЛ.
2. Выкарыстоўваючы схему, раскрыйце сутнасць аграрнай рэформы 1557 г. Ці можна яе назваць прагрэсіўнай? Прывядзіце аргументы.

**«Устава на валокі» 1557 г.**

| **Тэхнічныя** пераўтварэнні | **Эканамічныя** пераўтварэнні | **Сацыяльныя** пераўтварэнні |
|---|---|---|
| • абмер зямлі;<br>• падзел на валокі | • стварэнне фальваркаў;<br>• змены ў сістэме павіннасцей | • змены ў становішчы феадальна-залежнага насельніцтва |

3. Ахарактарызуйце развіццё гарадскога жыцця на тэрыторыі Беларусі ў XVI — першай палове XVII ст. Пералічыце найбольш істотныя змены ў параўнанні з перыядам Позняга сярэднявечча.
4. Якія асноўныя прычыны гарадскіх паўстанняў на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XVII ст.? Даведайцеся, ці былі падобныя выступленні характэрныя для іншых еўрапейскіх дзяржаў. Зрабіце вывад.
5. Назавіце асноўныя тэндэнцыі эканамічнага развіцця ВКЛ у XVI — першай палове XVII ст. Вылучыце агульныя і адметныя рысы эканамічнага развіцця ВКЛ у параўнанні з Заходняй Еўропай, усходнімі дзяржавамі.